# 60-ГОДДЗЮ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА —

З ВЯЛІКІМ уздымам камсамольцы і моладзь нашага ўніверсітэта працуюць над выкананнем гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ, XVIII з'езда ВЛКСМ. Выконваючы ленінскія запаветы, актыўна ўключыўшыся ў патрыятычны рух «Пяцігодцы эфектыўнасці і якасці — энтузіязм і творчасць маладых», юнакі і дзяўчаты ГДУ ў год 60-годдзя Вялікага Кастрычніка з падвоенай энергіяй нясуць ударную вахту 10-й пяцігодкі, імкнуцца настойліва вучыцца і працаваць.

## ГАТОВЫ ДА НОВЫХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ

Мы памятаем словы, сказаныя таварышам Л. І. Брэжневым у Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXV з'езду нашай партыі, якія ў поўнай меры адносяцца і да нас: **«Усе мы ведаем, як цягнецца ў будаўнічыя атрады моладзь. І гэтыя атрады робяць вялікую справу. За дзевятую пяцігодку яны выканалі аб'ём работ прыкладна на 5 мільярдаў рублёў. Немагчыма пераацаніць іх значэнне і як школы працоўнага выхавання».**

Кіруючыся рашэннямі XXVIII з'езда КПБ, у якіх гаворыцца, што кожны студэнт за час вучобы ў ВНУ павінен прайсці школу СБА не менш аднаго-двух разоў, у адпаведнасці з пастановай сакратарыята ЦК ВЛКСМ ад 20 красавіка 1976 года камітэт камсамола нашага ўніверсітэта, рэктарат, партком, дэканаты і камсамольскія арганізацыі факультэтаў правялі вялікую, сур'ёзную работу па фарміраванню СБА, падбору, расстаноўцы і навучанню кадраў кіраўнікоў атрадаў, падрыхтоўцы іх да правядзення грамадска-палітычнай дзейнасці на месцах дыслакацыі і паспяховаму выкананню вытворчай праграмы. Адказныя і складаныя задачы давядзецца вырашыць зводнаму СБА ўніверсітэта ў працоўным семестры-77.

На сённяшні дзень сфарміраваны зводны СБА ўніверсітэта ў складзе 37 лінейных атрадаў колькасцю 1155 чалавек (пры заданні 1030 чалавек). Атрады створаны на ўсіх факультэтах і падрыхтоўчым аддзяленні. Кожны чацвёрты студэнт — удзельнік працоўнага семестра. Атрады будуць працаваць на тэрыторыі Гомельскага, Жлобінскага, Рагачоўскага, Светлагорскага, Акцябрскага, Кармянскага, Чачэрскага, Буда-Кашалёўскага, Рэчыцкага, Ельскага раёнаў, у Малдавіі, Комі АССР, Цюменскай вобласці, Чэхаславакіі.

Згодна дагавораў зводнаму СБА ўніверсітэта прадстаіць асвоіць каля 1 мільёна 100 тысяч рублёў капітальных укладанняў.

За падрыхтоўчы перыяд была праведзена вялікая палітыка-выхаваўчая і агітацыйна-прапагандысцкая работа, дадзена 34 канцэрты мастацкай самадзейнасці, лектарскімі групамі прачытана 111 лекцый і дакладаў на прадпрыемствах і ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах. СБА ўніверсітэта адпрацавалі 90 суботнікаў і нядзельнікаў на прадпрыемствах і будоўлях горада.

Пры падрыхтоўцы да трэцяга, працоўнага семестра камітэтам камсамола ГДУ асаблівая ўвага ўдзялялася падбору і навучанню камандзіраў і камісараў. Трэба адзначыць, што ўсе падабраныя кандыдатуры адпавядаюць сваім пасадам. Яны паспяхова прайшлі школу камандыраў і камісараў СБА, здалі ўсе залікі.

Для кожнага атрада падрыхтаваны інструктары па тэхніцы бяспекі, дружыннікі-выратавальнікі, медыцынскія інструтары.

Спланавана праграма культурнай і палітыка-выхаваўчай работы. У кожным СБА створаны лектарскія групы, агітбрыгады мастацкай самадзейнасці, рэдкалегіі, абраны камсоргі.

Зводны СБА ўніверсітэта падтрымлівае патрыятычную ініцыятыву камсамольскай арганізацыі Беларускага політэхнічнага інстытута аб выкананні кожным байцом будатрада 60-ці дзённых норм і весці спаборніцтва ў трэцім, працоўным семестры юбілейнага 1977 года пад дэвізам «60-годдзю Вялікага Кастрычніка — 60 дзённых норм».

**М. КУЗЬМЕНКА,**
**сакратар камітэта ЛКСМБ ўніверсітэта.**



**НА ЗДЫМКУ:** актывісты студэнцкага будаўнічага руху над картай з адзнакамі месца дыслакацыі СБА ўніверсітэта.

## СТАТУТ БУДАЎНІЧАГА СТУДЭНЦКАГА АТРАДА

Студэнцкі атрад — аб'яднанне юнакоў і дзяўчат, якія добраахвотна выказалі жаданне ў перыяд летніх канікулаў працаваць у саставе Ўсесаюзнага студэнцкага атрада ў народнай гаспадарцы. Атрад заклікаы выхоўваць студэнтаў у духу калектывізму і камуністычных адносін да працы, фарміраваць высокія маральныя якасці, ідэйную стойкасць, пачуццё савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму.

### I.

1. Членамі атрада могуць быць студэнты, якія паспяхова выконваюць вучэбную праграму, не маюць медыцынскіх супрацьпаказанняў для работы ў атрадзе, прайшлі абучэнне правілам тэхнікі бяспекі, прызнаюць і выконваюць дадзены Статут.

Прыём у члены атрада праводзіцца камсамольскім бюро факультэта, курса навучальнай установы ў індывідуальным парадку на аснове асабістай заявы па рэкамендацыі камсамольскай арганізацыі вучэбнай групы.

Залічаным у атрад ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаюцца камсамольскія пуцёўкі, значкі Ўсесаюзнага студэнцкага атрада і знакі адрознення.

2. Члены атрада сваёй самаадданай працай уносяць канкрэтны ўклад у выкананне народнагаспадарчых планаў, дабіваюцца высокай якасці работы;

памнажаюць гераічныя традыцыі Ленінскага камсамола, выхоўваюць у сабе камуністычныя адносіны да працы, творчы падыход да працэсу вытворчасці, наватарства, дысцыплінаванасць, арганізаванасць, актыўна ўдзельнічаюць у сацыялістычным спаборніцтве;

мужна пераадольваюць любыя цяжкасці, праяўляюць прынцыповасць, таварысцкую ўзаемадапамогу, ставяць інтарэсы калектыву вышэй асабістых, берагуць і памнажаюць высокую грамадзянскасць, бескарыслівасць і маральную чысціню патрыятычнага руху;

з'яўляюцца актыўнымі прапагандыстамі палітыкі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, дасягненняў народаў СССР у будаўніцтве камуністычнага грамадства, прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці атрада, мясцовай камсамольскай арганізацыі;

умацоўваюць дружбу народаў СССР, уносяць уклад у развіццё супрацоўніцтва з юнакамі і дзяўчатамі сацыялістычных краін, дэмакратычнай моладзі свету;

строга выконваюць працоўную дысцыпліну, беражліва адносяцца да сацыялістычнай уласнасці, няўхільна выконваюць правілы тэхнікі бяспекі;

глыбока ведаюць дакументы, якія рэгламентуюць жыццё і дзейнасць працоўных студэнцкіх калектываў, кіруюцца імі ў сваёй практычнай дзейнасці, свядома выконваюць рашэнні штабоў і распараджэнні кіраўнікоў атрадаў, унутраны распарадак жыцця атрада, заўсёды падцягнуты, маюць чысты знешні выгляд;

маюць права звяртацца з пытаннямі ў любы штаб студэнцкіх атрадаў, аж да цэнтральнага штаба і патрабаваць адказу па сутнасці сваёй прапановы, просьбы або заявы.

### II

1. Асноўнай структурнай адзінкай Усесаюзнага студэнцкага атрада з'яўляецца лінейны атрад — калектыў студэнтаў, аб'яднаны агульным фронтам работ, вызначаным гаспадарчым дагаворам з прадпрыемствам, арганізацыяй, канкрэтнымі патрабаваннямі, і арганізуе сваю дзейнасць у адпаведнасці з гэтымі задачамі. Лінейны атрад можа складацца з некалькіх вытворчых брыгад, размяшчаецца ў студэнцкім лагеры, абсталяваным у адпаведнасці з санітарна-гігіенічнымі патрабаваннямі, і арганізуе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Палажэннем аб студэнцкім атрадзе і дадзеным Статутам.

2. Кіраўніцтва жыццём і дзейнасцю лінейнага атрада ажыццяўляе штаб, які зацвярджае камітэт камсамола адпаведнай навучальнай установы у саставе камандзіра, камісара, майстра, медыцынскага работніка, брыгадзіра і грамадскага інспектара па ахове працы.

Прынцыпам дзейнасці штаба з'яўляецца калегіяльнасць у прыняцці важных рашэнняў, якія вызначаюць жыццё і дзейнасць атрада. Штаб не радзей двух разоў у месяц праводзіць агульнаатрадныя сходы са справаздачай аб сваёй дзейнасці і абмеркаваннем становішча спраў у атрадзе.

Кантроль за вядзеннем расходаў і ўлікам атрадных сродкаў ажыццяўляе кантрольна-рэвізійная камісія, якая выбіраецца агульным сходам атрада і яму падпарадкоўваецца.

3. Персанальную адказнасць перад камітэтам камсамола навучальнай установы, рэктаратам і вышэйстаячым штабам за вытворчую, ідэйна-выхаваўчую і грамадска-палітычную дзейнасць атрада, стварэнне бяспечных умоў працы, унутрыатрадную і працоўную дысцыпліну нясуць камандзір і камісар.

Камандзіру належыць права адзінаначалля ў аператыўным кіраўніцтве дзейнасцю атрада, што азначае дакладнае і своечасовае выкананне членамі атрада распараджэнняў камандзіра. Аб прынятых у аператыўным парадку рашэннях камандзір абавязаны інфармаваць штаб атрада.

4. У выпадку неадпаведнасці займаемай пасадзе камандзір, камісар, майстар, медыцынскі работнік лінейнага атрада могуць быць вызвалены ад выканання сваіх абавязкаў вышэйстаячым штабам з далейшай інфармацыяй адпаведнага камітэта камсамола і рэктарата ВНУ.

### III

1. Члены атрада маюць форменную вопратку, знакі адрознення ўстаноўленага ўзору, нарукаўную эмблему.

2. У лінейнага атрада ёсць сцяг адзінага ўзору, а таксама назва, якая прысвойваецца рашэннем адпаведнага камітэта камсамола.

### IV

1. Камандзір, камісар, штаб атрада ў сваёй дзейнасці выкарыстоўваюць меры маральнага заахвочвання, а таксама ўносяць прапановы аб узнагароджанні членаў атрада, якія дасягнулі лепшых вынікаў у працы і грамадскай дзейнасці, кіраўніцтвам адпаведнага прадпрыемства, арганізацыі, камсамольскімі, прафсаюзнымі, савецкімі органамі.

Прапановы аб прадастаўленні да ўзнагароджання ў абавязковым парадку абмяркоўваюцца і зацвярджаюцца на агульным сходзе атрада.

2. Парушэнні Статута падлягаюць абмеркаванню штабам і агульным сходам атрада і спаганяюццаа аж да выключэння з атрада.

Незахоўванне правілаў тэхнікі бяспекі, ужыванне алкагольных напіткаў, гульні ў карты і іншыя адхіленні ад маральных норм паводзін савецкага студэнта несумяшчальны са званнем члена студэнцкага атрада.

3. Дадзены Статут дзейнічае на працягу працоўнага семестра.

**Дадзены Статут зацверджаны сакратарыятам ЦК ВЛКСМ 10 мая 1977 года.**

## КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПОСПЕХ

XXV з'езд КПСС паставіў задачу павысіць якасць работы ва ўсіх звеннях народнай гаспадаркі. У яе вырашэнні павінны прыняць удзел і студэнцкія будаўнічыя атрады. Што ж неабходна зрабіць у кожным лінейным атрадзе, каб павысіць эфектыўнасць яго работы?

Па-першае, працаваць строга па графіку, які дазволіць арганізаваць дзейнасць СБА рытмічна і раўнамерна з улікам магчымасцей атрада, замест паслядоўнага метада выканання работ, дзе гэта магчыма, прымяняць паралельна-паслядоўны. А дакладны графік пастаўкі матэрыялаў і механізмаў ліквідуе розныя няўвязкі з забеспячэннем.

Па-другое, патрэбна добрая прафесійная падрыхтоўка байцоў. Самая самаадданая праца без неабходнага мінімуму прафесійных ведаў і навыкаў нічога не дасць.

Па-трэцяе, неабходна строга прытрымлівацца правілаў тэхнікі бяспекі, памятаць, што ў кожным пункце правілаў сканцэнтраваны горкі вопыт папярэдніх пакаленняў будаўнічых атрадаў і грэбаванне правіламі прыводзіць да сумных вынікаў.

Нарэшце, трэба памятаць і аб тым, што студэнт на будоўлі — не проста рабочы, а асоба, якая яшчэ фарміруецца. Таму неабходна ствараць умовы не толькі для высокапрадукцыйнай працы, але і для карыснага адпачынку, далейшага развіцця асабістых якасцей і здольнасцей студэнта.

**М. БОРДАК,**
**галоўны інжынер абласнога штаба СБА, студэнт эканамічнага факультэта ГДУ.**

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**29 чэрвеня каля корпуса № 1 нашага ўніверсітэта адбудзецца ўрачысты мітынг, прысвечаны пачатку трэцяга, працоўнага семестра-77. Камандзірам і камісарам забяспечыць яўку байцоў СБА.**

**Пачатак мітынгу ў 10 гадзін.**

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА, ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ ГДУ.**